ДУК “Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”
Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49




Талачын, 2024

**ПРАЕКТ**

**Талачын, 2024**

**Назва праекта:**
“Беларускі чацвер. Наша спадчына”.

**Напрамак дзейнасці:** папулярызацыя нацыянальнай культуры: святы і абрады беларусаў.

**Абгрунтаванне праекта.**

Нашы продкі – беларусы пакінулі нам багатую духоўную спадчыну – вусную народную творчасць, якую яшчэ называюць фальклорам. Вусная народная творчасць, важнейшая частка духоўнай культуры народа, надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці беларусаў, але і ў актыўным бытаванні, адыграла вялікую ролю ў нацыянальнай самасвядомасці, ў развіцці літаратуры і мастацтва; яна плённа ўплывае і сёння на працэсы нацыянальнага адраджэння.

Праграма праекта прысвечана агульнаму знаёмству падлеткаў з відамі і жанрамі фальклору, вывучэнню жанраў пазаабрадавага фальклору, народных традыцый у сем’ях сучаснага грамадства і, нават, складанню навучэнцамі ўласных радаводаў. Праграма прадугледжвае таксама вывучэнне сямейна-абрадавага і каляндарна-абрадавага фальклору ў цеснай сувязі з даследваннем рэгіянальных фальклорных традыцый.

Асноўныя адметнасці дадзенага праекта:

- вывучэнне ўсіх відаў і жанраў фальклору беларускага народа;
- далучэнне юных чытачоў бібліятэкі да вывучэння і папулярызацыі фальклорных традыцый у рэгіёне:
- збор фальклорна-этнаграфічнай інфармацыі і правядзенне ў бібліятэцы і па-за яе сцэнамі фальклорных свят і абрадаў.

**Тэрмін рэалізацыі:** 2024 год

**Мэта:**

- вывучэнне гісторыі ўзнікнення беларускіх народных святаў і абрадаў, фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцяў.

**Задачы:**

- пашырэнне ведаў аб традыцыях святкавання беларускіх народных святаў;
- павышэнне цікавасці ў падрастаючага пакалення да правядзення народных свят і звычаяў (Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Іван Купала і інш.);
- папулярызацыя народных свят.

**Мэтавая аудыторыя:** дзеці ва ўзросце 7-15 год.

**Партнеры праекта:** ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Талачына імя М.П. Лугоўскага”, ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Талачына імя Ф.Я. Макавецкага", ДУ “Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей, ДУК “Талачынскі дом рамёстваў”.

**Чакаемыя вынікі:**

- фарміраванне ў падлеткаў устойлівага інтарэса да народнай творчасці;
- жаданне знаеміцца з разнастайнымі жанрамі беларускага фальклору.

## ПЛАН МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

| **Назва мерапрыемства** | **Форма правядзення** | **Час правядзення** | **Адказны** |
|---|---|---|---|
| "Каб жыла культура продкаў" | прадметна-тэматычная выстава | На працягу года | Жанткоўская В.А. |
| "Ехала Каляда ў чырвоным вазочку" | фальклорнае свята | студзень | Жанткоўская В.А. |
| "Вясёлая Масленіца" | фальклорна-спартыўнае свята | люты | Мальчыкава Г.У. |
| "Гісторыя нацыянальнай кухні" | літаратурна-пазнавальнае падарожжа | сакавік | Малашкевіч П.В. |
| "Чароўны квадрат" | інтэрактыўная віктарына | красавік | Юхневіч П.В. |
| "Сінь-васількі" | тэматычная вечарына | май | Мальчыкава Г.У. |
| "Духоўныя святы" | вусны каляндар | чэрвень | Жанткоўская В.А. |
| "У Купальскую ноч" | літаратурна-музычная кампазіцыя | ліпень | Юхневіч Г.А. |
| "Гуляем вяселле" | тэатралізаванае свята | жнівень | Малашкевіч П.В. |
| "Мы гасцей вітаем" | восеньская забава | верасень | Юхневіч Г.А. |
| "Хата ўцехамі багата" | фальклорныя пасядзелкі | кастрычнік | Мальчыкава Г.У. |
| "Беларускія вячоркі" | фальклорнае свята | лістапад | Жанткоўская В.А. |
| "Такія звыклыя і незнаёмыя рэчы..." | краязнаўчая гадзіна | снежань | Жанткоўская В.А. |

Загадчык гарадской
дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 _________________ В.А.Жанткоўская